**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за студзень 2022 г.

У студзені ў публічных бібліятэках ДУК быў праведзены раённы месячнік вернутай кнігі "Книги торопятся домой". У рамках месячніка ў бібліятэках прайшлі дні, тыдні даравана запазычальніка, гадзіны творчасці «Сакрэты кніжнага даўгалецця», акцыі «Чытач дарыць чытачу», бібліятэчныя ўрокі «Кніга пачынаецца з вокладкі», электронныя прэзентацыі «Вылячыць кнігу можа кожны», майстар-класы па вырабу кніжных закладак, латарэі па розыгрышы 10 першых нумароў чытацкіх квіткоў.

## Мерапрыемствы да Навагодніх свят і Раства

**4 студзеня**

Традыцыйная святочная Навагодняя акцыя «Стань першым!» стала жаданай для першых карыстальнікаў бібліятэкі. Наведвальнікаў чакалі прыемныя сюрпрызы - навагоднія віншаванні ад супрацоўнікаў бібліятэкі, прыгожыя паштоўкі і падарункі.

ЦРБ

**9 студзеня**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу і Нядзельнай школай правяла каляднае свята «Рождество пришло – радость принесло!». Прысутнічалі святары Свята-Петрапаўлаўскага храма айцец Аляксандр, айцец Сергій, айцец Уладзімір і старшыня раённага Савета дэпутатаў Іван Аляксеевіч Даўжук. Ігумен Свята-Петрапаўлаўскага храма павіншаваў прысутных і ўручыў дзецям калядныя падарункі. Жыхарам і гасцям вёскі паказаны спектакль па матывах казкі протаіерэя Арцемія Уладзімірава «Бисеринка, Жемчужинка, Алмазинка…».

Цёплым падарункам стала выступленне вакальнай групы «Фантазия» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі з канцэртнай праграмай «Зимней сказочной порою».

*Залеская ПБ, 130 чал.*

**11 студзеня**

У рамках праекта «Библиотека без границ» прайшлі калядныя вячоркі «Ярче вспыхнула звезда - наступили торжества» для падапечных цэнтра дзённага догляду інвалідаў і састарэлых Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. Бібліэтэкары рассказалі пра свет зімовых свят. Госці з задавальненнем удзельнічалі ў віктарынах, адгадвалі загадкі, успаміналі мультфільмы і песні, у якіх узгадваліся Новы год, Каляды і Вадохрышча.

Мерапрыемства завяршылася праглядам кліпа «З Новым годам і Калядамі» ад вакальнай групы «Фантазія» цэнтральнай бібліятэкі.

*ЦРБ, 23 чал.*

**15 студзеня**

Бібліятэка сумесна з работнікамі клуба правяла калядны вечар «Под чистым небом Рождества». Бібліятэкар расказала пра свята. Разам з гасцямі ўспомнілі старадаўнія ігры-забавы, абрадавыя песні-калядкі. конкурсы «Станцуй зиму», «Народные сказочники», гульні «Отгадай игрушку», «Рождественский шар». Кожны ўдзельнік атрымаў прыз на памяць.

Гарадзецкая ПБ, 30 чал.

**16 студзеня**

Падчас правядзення літаратурна-музычнага вечара «Смехом, шуткой, без забот, мы встречаем Новый год» члены клуба «Золотые россыпи» паўдзельнічалі у конкурсах «Продолжи стихотворение», «Верю - не верю», у гульнях «Детский карнавал», «Угадываем фильмы», у песеннай віктарыне «Новогодние мотивы», разам з Дзедам Марозам і Снегавіком адгадалі навагоднія загадкі. Паэтэса Надзея Момлік прачытала вершы пра зіму. Музычным падарункам сталі песні ў выкананні Наталлі Пушыла і Таццяны Брыштэль.

Дзівінскі філіял, 28 чал.

**16 студзеня**

Госцяй пасяджэння аматарскага аб'яднання «Каласок», фальклорнай гадзіны «Святки-колядки...» стала Алена Марчук, носьбітка старажытных традыцый, якая расказала дзецям пра цыкл калядных вечароў. Юныя чытачы чыталі калядкі, калядныя вершы, адгадвалі загадкі, удзельнічалі ў гульнях «Колечко», «Сто подруг», варожбах «Весёлый башмачок», «Кто кем будет», «Гадание в горшочках». Закончылася мерапрыемства чаяваннем.

Тэвельская ПБ, 25 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

По выніках абласнога конкурсу па стварэнні інавацыйных бібліятэчных праектаў «Бібліятэка для моладзі – бібліятэка магчымасцяў» Залеская публічная бібліятэка і Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка ўзнагароджаны дыпломамі пераможцаў.

*Бібліятэка магчымасцяў // Заря. – 2022. – 22 декабря. - С. 15.*

**16 студзеня**

Гумарыстычны спектакль «Страсці - мордасці ці...» тэатра-студыі «Піражок» пры Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы сабраў у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры аматараў тэатральнага мастацтва. Гэта амаль містычная гісторыя, напоўненая бліскучым гумарам, музыкай і танцамі. Яркія, смешныя, завадныя самадзейныя артысты пакарылі сэрцы

гледачоў, даказаўшы навакольным, што і будучы на пенсіі можна цікава бавіць час, быць актыўным і не паддавацца старасці.

*Кондрашук, Н. Страсти-мордасти, или… / Н. Кондрашук // Кобрин-информ. – 2022. – 22 декабря. - С. 15.*

*ЦРБ, 48 чал.*

**16 студзеня**

Пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» прайшло ў фармаце паэтычнай гадзіны «Созвучье слов живых». Паэты чыталі вершы, напісаныя ў якасці хатняга задання. Падчас гульні «Подарок другу» адгадвалі літаратурныя загадкі, атрымвалі падарункі. Водгук выклікала творчая сустрэча з Марынай Міхалюк, якая заняла трэцяе месца ў рэспубліканскім конкурсе, прысвечаным Году народнага адзінства.

ЦРБ, 17 чал.

**18, 19 студзеня**

Падчас правядзення гадзіны духоўнасці «Листая православный календарь» вядучыя пазнаёмілі навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа з галоўнымі праваслаўнымі святамі, з традыцыямі іх святкавання, з народнымі абрадамі і звычаямі. Прысутныя даведаліся пра гісторыю і значнасць хрысціянскіх свят, прагледзелі відэасюжэты пра Вялікдзень, Сёмуху і Успенне Прасвятой Багародзіцы, адказалі на пытанні віктарыны «Православные праздники».

ЦРБ, 78 чал.

**21 студзеня**

Для супрацоўнікаў публічных бібліятэк ДУК праведзены круглы стол «Публичные библиотеки системы: поиск – анализ – развитие». Начальнік аддзела культуры Валянціна Уладзіміраўна Пакалюк паставила перад бібліятэкамі задачы на цякучы год. Намеснік дырэктара ДУК азнаёміла прысутных з вынікамі работы сістэмы за 2021 год. Загадчык аддзела маркетынгу агучыла планы і перспектывы работы публічных бібліятэк сістэмы, прадставіла віртуальны альбом «В мою библиотеку прошу заглянуть». Метадысты пазнаёмілі з метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі работы ў Год гістарычнай памяці «Истории славной священные даты» і электронным банкам даных па афармленню бібліятэк.

ЦРБ, 42 чал.

**26 студзеня**

У рамках Тыдня памяці, прымеркаванага да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакоста, ў інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла мемарыяльная гутарка-рэквіем «Холокост: память без срока давности», гасцямі якой сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа. Бібліятэкары расказалі пра гісторыю стварэння канцэнтрацыйных лагераў у Германіі, Польшчы і ў 22 рэгіёнах сучаснай Расіі. Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Нам жизнь дана не для войны».

ЦРБ, 39 чал.

# <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

**20 студзеня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла прэзентацыя бягучага бібліяграфічнага паказальніка «Новая літаратура аб Кобрыне і Кобрынскім раёне за 2021 год», выдадзенага бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81